** Міністр замежных спраў БССР Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў, які быў урачом па прафесіі, у 1959 г. ад імя БССР выступіў у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый з прапановай стварэння Фонду па садзеянні барацьбе з ракавымі захворваннямі. Па яго ініцыятыве ў Мінску пачалося будаўніцтва анкалагічнага шпіталя. Аднак у сувязі з недахопам сродкаў яно было згорнута. Тады К. В. Кісялёў вырашыў выкарыстаць сваё выступленне ў ААН для таго, каб звярнуць увагу на праблему барацьбы з анкалогіяй. Ён паведаміў пра пасяховае будаўніцтва шпіталя ў Мінску і запрасіў Генеральнага сакратара ААН наведаць рэспубліку з візітам, каб той асабіста мог ацаніць унёсак БССР у агульную справу барацьбы з адным з самых каварных захворванняў чалавецтва. Аднак сваё выступленне К. В. Кісялёў не ўзгадніў з вышэйшым кіраўніцтвам, яно стала вынікам яго асабістай ініцыятывы. Будаўніцтва спецыялізаванага анкалагічнага шпіталя ў Мінску ў сувязі з візітам найвышэйшага прадстаўніка ААН было аднаўлена і ў хуткія тэрміны завершана. А К. В. Кісялёва за такія паводзіны знялі з пасады намесніка старшыні Савета Міністраў БССР. Паводле ўспамінаў яго дзяцей, калі бацька, пасля таго як быў пазбаўлены пасады, прыехаў з Масквы дамоў, ён паклікаў іх і сказаў: «Дзеці, пасады прыходзяць і сыходзяць, а бальніцы застаюцца».

***1.*** *Што выклікае ў вас пачуццё павагі да ўчынку К. В. Кісялёва?*
***2.*** *Які сэнс закладзены ў звароце К. В. Кісялёва да дзяцей? Свой адказ растлумачце.*

**1.** Запоўніце ў сшытку табліцу «Развіццё галін прамысловасці ў БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1960-х гг.».

| Прадпрыемствы машынабудавання | Прадпрыемствы хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці |
|---|---|
| | |

**2.** Чаму праца па пасляваенным аднаўленні эканомікі БССР стала агульнанародным подзвігам?
**3.** Чаму першую пасляваенную пасяўную кампанію ажыццявілі пераважна жанчыны і падлеткі?
**4.** Параўнайце метады правядзення калектывізацыі ў БССР у міжваенны перыяд і ў заходніх абласцях БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны.
**5.** У чым заключалася павышэнне дабрабыту насельніцтва БССР?
**6.** Дакажыце, што ў БССР адбываўся працэс фарміравання індустрыяльнага грамадства.

## § 21. Грамадска-палітычнае становішча ў другой палове 1960-х — 1980-я гг.

***Успомніце.*** Што такое «адліга» і рэабілітацыя?

***Вучэбная задача.*** Ахарактарызаваць змены ў грамадска-палітычным жыцці БССР у другой палове 1960-х — 1980-я гг.

**Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі.** У грамадска-палітычным жыцці БССР працягвалася далейшае ўмацаванне ролі

Правообладатель Издательский центр БГУ

Камуністычнай партыі. Такое становішча было афіцыйна замацавана ў прынятай у 1977 г. Канстытуцыі СССР, якая атрымала неафіцыйную назву «Канстытуцыя развітога сацыялізму». Адзначалася, што ў СССР пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства і сфарміравана новая гістарычная супольнасць — савецкі народ. Да яго разам з грамадзянамі ўсіх савецкіх рэспублік адносіліся і беларусы. Для савецкага народа сталі ўласцівымі такія рысы, як савецкі патрыятызм і служэнне грамадству, калектывізм і грамадска карысная праца, інтэрнацыяналізм і дружба народаў Савецкага Саюза, гуманізм і агульная камуністычная ідэалогія.

Разам з тым палажэнне аб пабудове ў СССР развітога сацыялістычнага грамадства стала тэарэтычным абгрунтаваннем для далейшага ўціску рэлігійнага жыцця з боку дзяржавы. Яго існаванне ў такім грамадстве не прадугледжвалася. Праводзіліся мерапрыемствы па закрыцці цэркваў, касцёлаў, скасаванні дзеючых рэлігійных абшчын.

Камуністычная партыя Беларусі (КПБ) у адпаведнасці з шостым артыкулам Канстытуцыі БССР 1978 г. абвяшчалася кіруючай і накіроўваючай сілай у грамадстве, ядром палітычнай сістэмы. Першым сакратаром ЦК КПБ у 1965—1980 гг., а значыць, фактычна кіраўніком рэспублікі, быў П. М. Машэраў.

Ураджэнец Сенненшчыны **Пётр Міронавіч Машэраў** (1918—1980) скончыў Віцебскі педагагічны інстытут (цяпер Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава). Перад вайной працаваў настаўнікам фізікі і матэматыкі ў Расонах і карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод вучняў. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію, трапіў у палон, але змог збегчы. Стварыў і ўзначаліў падпольную камсамольскую арганізацыю ў Расонах, якая дзейнічала ва ўмовах акупацыі. Быў двойчы паранены.



П. М. Машэраў

У 26 гадоў яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У час вайны акупантамі была схоплена і пасля катаванняў расстраляна маці Машэрава. Яго ўсё жыццё мучыла думка, што ён мог яе забраць да сябе ў партызанскі атрад і тым самым выратаваць. Пасля вайны, наведваючы магілу маці, Машэраў сыходзіў спінай уперад, а тварам да помніка, бо не мог адвярнуцца. Пасля вайны быў абраны першым сакратаром Цэнтральнага камітэта Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі. Карыстаўся вялікай павагай сярод насельніцтва за чалавечнасць, даступнасць, дэмакратычнасць. Аднойчы, наведваючы К. П. Арлоўскага, які цяжка хварэў, П. М. Машэраў апусціўся каля яго на калені і запытаўся, чаму ён ляжыць у цемры. На наступны дзень па яго распараджэнні правялі святло на вуліцы, дзе жыў славуты старшыня калгаса. У перыяд дзейнасці П. М. Машэрава БССР дасягнула значных поспехаў у стварэнні індустрыяльнага патэнцыялу, стала адной з высокаразвітых рэспублік СССР, а сам Машэраў быў узнагароджаны зоркай Героя Сацыялістычнай Працы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

П. М. Машэраў пра сваю жыццёвую пазіцыю гаварыў так: «Не столькі трэба самому ведаць і ўмець, колькі бачыць добрае ў іншых людзях. Тады і сам будзеш многае значыць. Вось мая мараль, вось мой прынцып… Таму я жыву. Я вельмі люблю людзей… І перажываю з прычыны недахопаў, якія ёсць у многіх».

*Што з жыццёвых прынцыпаў П. М. Машэрава вам хацелася б пераняць?*

№ 16

**Удзел насельніцтва БССР у грамадска-палітычным жыцці.** Грамадская актыўнасць насельніцтва БССР была дастаткова высокай. Тлумачылася гэта тым, што ў гады «адлігі» ў людзей з'явілася вера ў магчымасць усталявання сапраўднага народаўладдзя і аднаўлення справядлівасці ў дачыненні да неабгрунтавана рэпрэсаваных. Немалаважнае значэнне мела і дзейнасць партыйных і ўрадавых кіраўнікоў. Спрыяльным фактарам у фарміраванні прыхільнага стаўлення жыхароў рэспублікі да ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці і палітыкі партыі з'яўлялася таксама павышэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

Грамадзяне БССР удзельнічалі ў выбарах і рабоце Саветаў народных дэпутатаў, партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый. Аднак у выбарчай сістэме працягвала існаваць безальтэрнатыўная практыка абрання дэпутатаў, чые кандыдатуры былі загадзя ўзгоднены з партыйным кіраўніцтвам.

У БССР, таксама як і ў іншых савецкіх рэспубліках, рэгулярна арганізоўваліся масавыя сходы, мітынгі, грандыёзныя вулічныя шэсці, прысвечаныя святкаванню дзён Кастрычніцкай рэвалюцыі і Першага мая, Перамогі і вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З вялікай урачыстасцю адзначаліся ленінскія дні, знамянальныя даты ў гісторыі КПСС, выбары ў Саветы народных дэпутатаў, прынятце новай Канстытуцыі СССР 1977 г. і Канстытуцыі БССР 1978 г.




Дэманстрацыя працоўных горада Мінска. Фотаздымак 1976 г.

Адлюстраваннем пачуцця патрыятызму савецкага чалавека было стаўленне большасці беларускага насельніцтва да ўводу савецкіх войскаў у Афганістан у 1979 г. Такое рашэнне ўспрымалася як выкананне інтэрнацыянальнага абавязку і тлумачылася неабходнасцю дапамогі паўднёваму суседу СССР у барацьбе за самастойнае развіццё. Насамрэч гэта была падтрымка савецкім кіраўніцтвам тагачаснага палітычнага рэжыму ў Афганістане. У далейшым увод войскаў у Афганістан быў прызнаны палітычнай памылкай, умяшаннем ва ўнутраныя справы іншай дзяржавы (**).

**Палітыка перабудовы ў БССР.** Палітыка, распачатая з сярэдзіны 1980-х гг. кіраўніцтвам СССР на чале з М. С. Гарбачовым, атрымала назву **«перабудова»**. Адным

Правообладатель Издательский центр БГУ

з яе рэальных дасягненняў у грамадска-палітычным жыцці стала **галоснасць** — прынцып адкрытасці інфармацыі пра мінулае і сучаснасць краіны, магчымасць выказваць крытычнае стаўленне да ўлады і тагачаснай ідэалогіі, рэалізоўваць на справе абвешчаныя Канстытуцыяй БССР 1978 г. дэмакратычныя свабоды слова і друку. Важным крокам на шляху пашырэння ролі народа ў вырашэнні дзяржаўных спраў у Беларусі стала прыняцце ў 1988 г. Закона «Аб народным абмеркаванні важных пытанняў дзяржаўнага жыцця Беларускай ССР».

У 1990 г. згодна з новым выбарчым законам адбылося абранне народных дэпутатаў БССР на альтэрнатыўнай аснове. Гэта значыць, на кожнае месца ў Вярхоўны і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў прэтэндавалі некалькі кандыдатаў, а канчатковае рашэнне было за выбаршчыкамі. Пры такой сістэме кожны кандыдат павінен быў асабіста ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі, распрацаваць і прапанаваць сваю выбарчую праграму. Упершыню ў гісторыі Вярхоўнага Савета БССР у ім узнікла парламенцкая апазіцыя — група дэпутатаў, чые погляды не супадалі з пазіцыяй дэпутацкай большасці альбо супярэчылі ёй. У гэтых умовах замест фармальнагааднагалоснага зацвярджэння законаў у Вярхоўным Савеце БССР праходзіла іх абмеркаванне, адбываліся вострыя дыскусіі па праблемных пытаннях, разглядаліся шматлікія прапановы.

**Фарміраванне шматпартыйнасці.** Партыйнае кіраўніцтва ў Беларусі ва ўмовах палітыкі перабудовы схілялася да адстойвання аднапартыйнай сістэмы. Кампартыя Беларусі працягвала лічыць сябе «кіруючай і накіроўваючай сілай грамадства». Аднак у 1990 г. быў адменены шосты артыкул Канстытуцыі СССР, у якім замацоўвалася кіруючая і накіроўваючая роля Камуністычнай партыі.

Зараджэнне і фарміраванне шматпартыйнасці ў Беларусі праходзіла вельмі складана і супярэчліва. У 1989 г. сфарміравалася палітычная арганізацыя пад назвай «Беларускі народны фронт за перабудову „Адраджэньне“» (БНФ). У 1990 г. быў прыняты Закон СССР «Аб грамадскіх аб'яднаннях», які замацаваў права грамадзян на свабоднае аб'яднанне і стварэнне палітычных партый, рухаў. У пачатку 1990-х гг. у Беларусі ўзнікла каля 10 палітычных партый. Сярод іх — Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада` Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі і інш. Аднак большасць створаных партый былі невялікімі па колькасці і ўяўлялі сабой згуртаванні вузкіх колаў аднадумцаў.

У жніўні 1991 г. у Маскве адбыўся путч — спроба невялікай групы партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў здзейсніць дзяржаўны пераварот з мэтай вярнуць СССР у «даперабудовачны» час. Жнівеньскі путч пацярпеў няўдачу. У сувязі з гэтымі падзеямі 25 жніўня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову «Аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ — КПСС на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», якая дзейнічала да 1993 г.

Такім чынам, перыяд існавання аднапартыйнай палітычнай сістэмы на чале з КПБ, кіруючая роля якой замацоўвалася ў Канстытуцыі, змяніўся перыядам перабудовы. Яна была звязана з галоснасцю, са стратай КПБ манаполіі на ўладу і з'яўленнем шматпартыйнасці, а таксама з правядзеннем выбараў народных дэпутатаў на альтэрнатыўнай аснове і фарміраваннем парламенцкай апазіцыі ў Вярхоўным Савеце БССР.

***Новыя паняцці і тэрміны**: перабудова, галоснасць.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

****1.** Адной з першых у Афганістан была ўведзена 103-я гвардзейская асобная паветрана-дэсантная дывізія, якая да таго размяшчалася ў раёне Віцебска. За выкананне інтэрнацыянальнага абавязку дывізія была ўзнагароджана ордэнам Леніна. У складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане служыла каля 30 тыс. ураджэнцаў Беларусі. Горам і болем адгукнулася ў сэрцах беларускіх маці, жонак і сясцёр гібель іх родных, што выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане. Самалёты, якія называлі «чорныя цюльпаны», прывозілі на радзіму «груз 200» — забітых салдат і афіцэраў у цынкавых трунах. Напамінам пра гэтую вайну стала адкрыццё ў Мінску помніка «Сынам Бацькаўшчыны, якія загінулі за яе межамі». Ён узведзены побач з цяперашнім праспектам Пераможцаў на рацэ Свіслач на «Востраве мужнасці і смутку». У народзе гэты востраў называюць «востравам слёз». Сёння па традыцыі сюды ідуць маладыя, каб ушанаваць памяць сваіх суайчыннікаў, што загінулі на чужыне. У яго цэнтры — капліца з 771 імем воінаў, што аддалі свае жыцці ў Афганістане. Таксама на востраве размешчана скульптура маленькага анёла, які плача, бо не змог выканаць сваю святую місію — зберагчы воінаў ад смерці.



Помнік «Сынам Бацькаўшчыны, якія загінулі за яе межамі», і скульптура анёла насупраць яго

****2.** У спіс асабовага складу 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі навечна залічана імя Героя Савецкага Саюза, ураджэнца Пухаўшчыны, 19-гадовага старэйшага сяржанта **Мікалая Чэпіка**, які загінуў у Афганістане. Незадоўга да яго гераічнай гібелі маці напісала яму ліст: «Добрага здароўя, мой дарагі сыночак Колечка. Як твая служба, сынок? …Калі ўжо дамоў? …Чакаем лістоў ад цябе. Як жа доўга ідуць лісты, сынок, з вашых краёў! …Я ўжо мукі назапасіла і дражджэй да твайго прыезду. Як вернешся, напяку пірагоў, якія ты любіш.

На мінулых выхадных ездзілі з бацькам у горад, купілі табе касцюм. Ведаеш, такі модны: пінжак карычневы, з накладнымі кішэнямі, шырокімі штрыфлямі і ватнымі плячамі. Цяпер уся моладзь у такіх касцюмах на танцы ходзіць… Як уяўлю, што вы з Валяй пад ручку пойдзеце на танцы і ты — у гэтым касцюме, прыбраны. На сэрцы так цёпла робіцца. Валечка цябе чакае.



М. Чэпік

…Служы, сынок. Чакаем цябе, мой дарагі. Усёй сям'ёй чакаем. Лічым дзянёчкі да твайго вяртання. Тут ужо ўсяго два месяцы засталося. Прыедзеш, дома якраз сады квітнець будуць.

Да спаткання, сыночак. Цалую. Мама».

***1.** Выкажыце сваё стаўленне да ўдзелу вайскоўцаў — ураджэнцаў Беларусі ў выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане.*

***2.** Ахарактарызуйце адносіны маці М. Чэпіка да свайго сына.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Параўнайце асноўныя святы, якія адзначаліся ў 1970—1980-я гг., з сучаснымі дзяржаўнымі святамі.
2. Якімі прычынамі тлумачылася грамадская актыўнасць новай гістарычнай супольнасці — савецкага народа, да якога таксама належалі і беларусы?
3. Вызначце, аб чым сведчыла скасаванне шостага артыкула Канстытуцыі БССР 1978 г.
4. Складзіце ў сшытку параўнальную табліцу «Асноўныя рысы грамадска-палітычнага жыцця ў БССР» і зрабіце выснову аб іх адрозненні.

| Прыметы для параўнання | Другая палова 1960-х — першая палова 1980-х гг. | Другая палова 1980-х гг. |
|---|---|---|
| Становішча палітычных партый | | |
| Выбары ў Саветы народных дэпутатаў | | |

5. Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Беларускія „афганцы“: выкананне інтэрнацыянальнага і канстытуцыйнага абавязку перад Радзімай» і прэзентуйце яго пры правядзенні ўрока абагульнення па раздзеле IV.

# § 22—23. Сацыяльна-эканамічнае становішча ў другой палове 1960-х — 1980-я гг.

***Успомніце.*** Якімі былі новыя галіны прамысловасці, звязаныя з фарміраваннем індустрыяльнага грамадства ў БССР?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць асноўныя дасягненні і супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1960-х — 1980-я гг.

**Фарміраванне прамысловага комплексу БССР.** У сярэдзіне 1960-х гг. у СССР знізіліся сярэднегадавыя паказчыкі прыросту прадукцыі і прадукцыйнасці працы ў прамысловасці. Адной з прычын гэтых працэсаў з'яўлялася цэнтралізаваная сістэма планавання і кіравання надзвычай складанай народнай гаспадаркай усяго СССР, у тым ліку і БССР. У 1965 г. для аптымізацыі кіравання народнай гаспадаркай у СССР была праведзена эканамічная рэформа. Замест 100 абавязковых планавых паказчыкаў прамысловай прадукцыі, якія вызначала дзяржава, засталіся толькі 8, а астатнія планавалі самі прадпрыемствы. Ранейшы галоўны паказчык работы прадпрыемства — аб'ём усёй выпушчанай прадукцыі — саступіў месца аб'ёму прададзенай прадукцыі. На прадпрыемствах уводзіўся гаспадарчы разлік — метад гаспадарання, пры якім даходы, што атрымлівала прадпрыемства ад рэалізацыі сваёй прадукцыі, павінны былі пакрываць і перавышаць яго выдаткі на вытворчасць. У выніку ажыццяўлення рэформы быў паспяхова выкананы план восьмай пяцігодкі (1966—1970). Яна аказалася самай выніковай у пасляваенны перыяд.


Правообладатель Издательский центр БГУ